**УДК 792, 7 : 39 (476. 5)**

# ПОЛАЦКІ РОК-ГУРТ «ДЗІДА» У КАНТЭКСЦЕ ЭТНАЛАГІЧНАГА ПРАЦЭСУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ КАНЦА 1980-х-ПАЧАТКУ 1990-х

***А.С. КРУТКІН***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук У.А. ЛОБАЧ)***

*Шэраг даследчыкаў лічыць, што напрыканцы 1980-ых – пачатку 1990-ых у Беларусі адбыўся такі этналагічны працэс як нацыянальна-культурніцкае адраджэнне.На наш погляд, рок-гурты таго часу шлі ў авангардзе дадзенага працэсу.Полаччыну ў тыя часы называлі "рок-сталіцаю" беларусі.У гэтым кантэксце цікава было б прасачыць дзейнасць у дадзеным накірунку, уплыў на працэсы культурніцкага адраджэння краіны, заснавальніка беларускага трэш-мэталу полацкага гурта "Дзіда".*

Рок-гурт "Дзіда" утварыўся у 1989 годзе. Да 1990 года гурт называўся "Стрэс". Пад такой назвай гурт выступіў і на фестывалі "Рока-кола 90".Гурт там выканаў кампазіцыю "Крыжакі" якую напісаў рытм-гітарыст "Стрэса" Валерый Воліс. Тэкст песні: "Азірніся вакол, Ты убачыш крыжы, Твае думкі і твар Перакрэсляць яны. Перакрэсляць цябе, калі ты не такі, не такі як усе, Як яны, крыжакі."Гэта кампазіцыя была прысвечана ворагам беларускага народа, любым захопнікам, але хутчэй за усё тут маелася на ўвазе савецкая таталітарная сістэма пры якой пераследвалася любога роду іншадумства і альтэрнатыўныя погляды. Пасля фестывалю гурт змяніў назву на "Дзіда". Гурт граў у стылі трэш-мэтал.У 1990 годзе у склад гурта уваходзілі АляксандрКалеснік(вакал), ВалерыйВоліс(тэксты, рытм-гітара),УладзімірДзёмін(бубны), Алесь Цярэшка (лідэр-гітара), Уладзімір Курсанаў (бас-гітара)[6]. Да "Рока-колы90" гурт удзельнічаў у 1989 годзе у Наваполацкім фестывалі маладзёжнай песні. Гралі ў стылі трэш-метал, карані якога можна заўважыць у сінфамузыцы і у народнаймузыцы. Гэта кажа аб тым, што трэш ўжо сам па сабе моцна звязаны з народнай традыцыйнай духоўнай культурай. Да беларускай мовы калектыў прыйшоў дзякуючы выступу 26 чэрвеня 1990 года у Полацку танцораў ансамбля "Васілёк"(прадстаўнік беларускай дыяспары ў ЗША) і фальклёрнага ансамбля "Жывіца"(салістка Валянціна Пархоменка), на якім прысутнічаў В.Воліс. На наступныдзень Воліс прызнаўся, што падчас канцэрту ў яго ўзнікла думка зрабіць "трэшовую рэч" з фрагментамі пачутых беларускіх народных кампазіцый[4]. Тут можна зрабіць яшчэ раз выснову, што мэтал, негледзячы на тое, што ён з'яўляецца прадуктам глабалізацыі, не толькі можамець сінтэз з традыцыйнай культурай, але наадварот як правіла без яе горш успрымаецца. Аўтарам шэрагу тэкстаў песен "Дзіды" з'яўляецца полацкая паэтка Лера Сом, што яшчэ раз падкрэслівае сувязь нацыянальнай паэзіі з рок-музыкай. На фестывалі "Рока-кола91" "Дзіда" выканаў новую песню, на верш Леры Сом і Валерыя Волісу – "Поскудзь": "З выгляду быццам грозныя Спробуй капнуць, дык тухлыя Поскудзь бывае розная: Ёсць і худыя і пухлыя. Вунь пасміхаюцца міла, Душы нібы адкрыты,Толькі свінячыя рылы Не адвярнуць ад карыта. Свінням не веру болей Выйшаў даўно з запою Мокрай плямай на стол<br>і З'зяюць гады застою Свіння дастае насоўку: " – Я разбяруся сам! Хрэн вам, а не тусоўку! Выдаць дручкі ментам!" Вось ужо жыць не міла, Людзі сталі як дрэвы: Выдраны ўсе жылы, Парваны усе нервы Што нам гніючыя шаты – Гэта для нас не тэма, Лепшыя у свеце краты Падрыхтаваласістэма. "Людзям жыць добра досыць, Усе яны нам халопы", - Так разважае поскудзь І топча нас у балота". У гэтай кампазіцыі можна пабачыць крытыку савецкай палітычнай сістэмы, а таксама бюракратыі, якія зрабілі з беларусаў савецкіх грамадзян, якія абсалютна ўжо не уяўлялі сабою ні нацыю, ні грамадзянскую супольнасць, а таксама тут ёсць тое, што савецкая улада актыўназмагалася з незалежнымі суполкамі. Людзі скандавалі на тымфестывалі: "Дзіда!Дзіда!Дзіда!" [6]. Гэта кажа аб тым, што гурт гэтай кампазіцыяй вельмімоцназ акрануў публіку і дадзеная песня была вельмі актуальна і адпавядала часу. Уладзь Дзёмін быў узнагароджаны прызам – як лепшы бубнач фестывалю і, дзякуючы яму "Дзіда" выступіла і на галаканцэрце. [Там жа] У кастрычніку 1991 года на першым музычным хіт-парадзе радыё "Свабода"(Мюнхен), кампазіцыя "Дзіды "Крыжакі" увайшла у дзесятку самых папулярных песен, заняўшы дзявятае мейсца[2]. Гэта сведчыць аб тым, што у той час шмат слухачоў радыё "Свабода" былі супраць савецкай таталітарнай сістэмы, пра якую у дадзенай кампазіцыі спяваў гурт. У кастрычніку "Дзіда" удзельнічала ў канцэрце на плошчы Леніна у Мінску падназвай "Беларускі рок вітае незалежнасць" [8, с. 333]. Дадзены факт гаворыць пра тое, што безумоўна гурт быў за незалежную Беларусь. На музычным хіт-парадзе Радыё "Свабода" у лютым 1992 года кампазіцыя "Дзіды" "Поскудзь" знаходзілася на дзесятым мейсцы [1]. А у сакавіку гэтага ж года, тая ж кампазіцыя гурта была ужо на шостай пазіцыі, у маі 1992 года кампазіцыя "Поскудзь"апусцілася на дзявяты радок [3]. Безумоўна, гэта паказвае, што і ў 1992 годзе, ужо пасля развалу СССР, для гэтага перыяда была актуальна тэма наменклатуры і бюракратыі, бо негледзячы на тое, што кампартыя ўжо не існавала, тым

не менш ва уладзе знаходзіліся амаль тыя ж самыя людзі, у Беларусі не прыйшлі да улады нацыянальна-арыентаваныя сілы. У маі 1992 года “Дзіда” атрымаў перамогу на “Рока-коле92” [7]. У ліпені 1992 года “Дзіда” прыняў удзел у фестывалі на тэрыторыі Польшчы “Басовішча”.Удзельнікі гурта адчулі, што у Польшчы больш чым у Беларусі фанатаў трэш-мэталу. Гурт застаўся працаваць у Польшчы. Там ён адразу атрымаў запрашэнне выступіць у Ярацыне(Бельгія). Гэта кажа пра пэўную зацікаўленасць творчасцю гурта у Заходняй Еўропе. ВітаўтМартынека: “ Невядома,ці пачуем мы яшчэ сапраўдны беларускі трэш, але любое мастацтва квітнее там, дзе ягоразумеюць”[5]. У гурта на Радзіме былі пэўныя фінансавыя праблемы, а ў Польшчы, краіне дзе метал мае пэўны росквіт(Варта хаця б узгадаць вядомыя польскія мэтал-каманды “Behemoth” і «Made of Hate») яны вырашылі рэалізаваць свой патэнцыал. Такім чынам “Дзіда” стаў першым гуртом пасляна быцця незалежнасці, на які паўплывала фінансавае становішча. Наступнымі будуць полацкі “Мясцовы час”, мінскі “Уліс”, віцебская “Грамада”, наваполацкі “Грунвальд”. ”Мроя” таксам знікне, бо музыкі вымушаны будуць змяніць фармат і пераўтварыцца у “N.R.M”. Час гуртоў перабудовы, адраджэння і рамантыкі у 1992-1994 сыходзіў у нябыт. Варта дадаць яшчэ адзін цікавы момант:у 2008 годзе сынам В.Воліса гурт “Дзіда” быў часова адраджоны, але гурт на жаль выконваў свае песні на расійскай мове…

ЛІТАРАТУРА

1. Гуненка, В. Ліхадзеям на зло / В. Гуненка // Чырвоная змена. – 1992. – 9 – 15 сакавіка. – С. 9.
2. Гуненка, В. Новы, беларускі / В. Гуненка // Чырвоная змена. – 1991. – 4 – 10 лістапада. – С. 14.
3. Гуненка, В. Рок – гэта пазіцыя / В. Гуненка // Чырвоная змена. – 1992. – 29 чэрвеня – 5 ліпеня. – С. 14.
4. Лейтман, А. Трапная полацкая “Дзіда” / А. Лейтман // Чырвоная змена. –1990. – 8 верасня. – с. 12.
5. Мартыненка, В. Бесы на “Басовішчы” / В. Мартыненка // Чырвоная змена. – 1992. – 27 ліпеня – 2 жніўня. – С. 8-9.
6. Мартыненка, В. Наваполацкае кола адраджэння / В. Мартыненка // Чырвоная змена. – 1990. – 19 мая. – С. 9.
7. Мартыненка, В. Не спыняе колы “Рока-кола” / В. Мартыненка // Чырвоная змена. – 1992. – 1 – 7 чэрвеня. – С. 9.
8. Мартыненка, В. 222 альбомы беларускага року і ня толькі… Праз рок-прызму : даведкавае выданне / В. Мартыненка, А. Мяльгуй. – Мінск : Медысонт, 2006. – 431 с.

**УДК 9и(72)01(367):070.443**

## РОЛЬ ТОРГОВЛИ И ВОДНЫХ ТОРГОВЫХ ПУТЕЙ В СТАНОВЛЕНИИ ГОРОДОВ ДРЕВНЕЙ РУСИ: ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ

***А.В. РЕМЕНЧИК***
***(Прадстаўлена: канд. біол. наук У.А. ЛОБАЧ)***

*Сделан обзор трудов ученых-исследователей, отмечавших значительную и, быть может, ключевую роль торговли и водных торговых путей в процессе образования городов и становления государственности.*

В исторической и археологической литературе вопросы определения хронологии, роли и значения пути «из варяг в греки» в истории Древней Руси уже давно стали узловыми. Древнейшим источником, который повествует нам о пути «из варяг в греки» была «Повесть временных лет» [1].

Однако еще в трудах Геродота находятся упоминания о важнейших реках Восточной Европы, в том числе о Днепре (древнем Борисфене). В четвертой книге своей «Истории», Геродот сообщает сведения о торговых сношениях на Днепре и выражает свой восторг перед необыкновенным богатством и величием рек. «В Скифии, – говорит он, – нет ничего удивительного, кроме рек, ее орошающих: они велики и многочисленны» [2].

Наиболее значительным достижением российской дореволюционной историографии в вопросе происхождения городов явилась теория В.О. Ключевского, изложенная в его монографии «Боярская дума Древней Руси», согласно которой города возникли «как сборные места русской торговли, пункты склада и отправления русского вывоза» [3]. Она получила определение в исторической литературе как «торговая теория». Роль Днепровского водного пути сообщения для исторических судеб средневековой Восточной Европы неоспорима, и Днепру, как одной из важнейших магистралей средневековья, посвящены обширные исторические исследования. В.О. Ключевский писал: «река воспитывала дух предприимчивости, привычку к совместному, артельному действию, заставляла размышлять и изловчаться, сближала разбросанные части населения, приучала чувствовать себя членом общества, обращаться с чу-